# Беларуская мова. III клас
# Раздзел «Тэкст»

Вывучэнне раздзела «Тэкст» забяспечвае навучэнцаў неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Вывучэнне гэтага раздзела мае выразную практычную скіраванасць і патрабуе пастаяннай дапамогі і кіраўніцтва з боку настаўніка ў працэсе выканання вучнямі заданняў і практыкаванняў. Уменні і навыкі, якія фарміруюцца ў навучэнцаў трэцяга класа на аснове працы з тэкстам, уяўляюць сабой не паўтарэнне, а дапаўненне ўменняў і навыкаў, сфарміраваных у папярэдніх класах.

Асноўнымі **задачамі** вывучэння раздзела «Тэкст» у III класе з'яўляюцца:

- фарміраванне ўяўленняў пра спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце (выражэнне асноўнай думкі тэксту адным з яго сказаў, выражэнне асноўнай думкі тэксту загалоўкам);
- фарміраванне ўменняў складаць план тэксту з пытальных і апавядальных сказаў;
- фарміраванне ўменняў складаць тэкст па плану.

Вучні практыкуюцца ў складанні тэкстаў са сказаў, слуханні тэксту і адказах на пытанні па змесце, вызначэнні і фармулёўцы асноўнай думкі тэксту, выбары і выкарыстанні моўных сродкаў для выказвання думкі, вусным і пісьмовым падрабязным пераказе невялікага апавядальнага тэксту па калектыўна складзеным плане, складанні вуснага паведамлення на зададзеную тэму па апорных словах, складанні сачынення па серыі малюнкаў і калектыўна складзеным плане.

## Урок 6. Прыметы тэксту

***Мэты:*** актуалізаваць веды вучняў пра тэкст як цэласнае выказванне на пэўную тэму, пра загаловак як сродак прэзентацыі тэксту, па якім можна прагназаваць яго тэму або асноўную думку; выпрацоўваць уменні адрозніваць тэкст ад набору сказаў, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, суадносіць загаловак з тэмай і асноўнай думкай тэксту; развіваць мысленне, звязнае вуснае маўленне; выхоўваць любоў да Радзімы, яе гісторыі, пашану да продкаў.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі прыроды Беларусі, вырабаў ткацтва, саломапляцення, ганчарства; фотаздымкі славутых людзей Беларусі, кніг Францыска Скарыны, аўдыёзапіс песень «Слуцкія ткачыхі» (сл. М. Багдановіча, муз. Ул. Мулявіна), «Люблю цябе, Белая Русь» (сл. Ул. Карызны, муз. Ю. Семянякі), прэзентацыя «Нясвіжскі замак», фотаздымкі славутых мясцін той мясцовасці, у якой жывуць вучні.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першы сказ. Якім словам вы дапоўнілі яго? Які знак уставілі ў гэтае слова на месцы пропуску? Чаму? (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі і словамі.)

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Мы пачынаем вывучаць тэму «Тэкст». Сёння на ўроку прыгадаем вядомыя нам прыметы тэксту.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 32.

— Прачытайце дзве групы сказаў. Якая з іх з'яўляецца тэкстам? Як вы гэта вызначылі?

— Давайце звернемся да схемы на форзацы падручніка і праверым, ці правільна мы назвалі прымету тэксту. (Вучні чытаюць інфармацыю, змешчаную на схеме.)

— Спішыце тэкст. Што такое спадчына? *(Тут: з'явы культуры, быту, якія засталіся ад папярэдніх эпох, дзеячаў.)*

***3. Развіццё маўлення.***

На дошцы малюнкі (рыс. 1).



*Рыс. 1*

— Разгледзьце малюнкі на дошцы і адкажыце, што засталося нам у спадчыну ад продкаў.

Навучэнцы называюць мову, кнігі, помнікі архітэктуры, славутых людзей (Францыск Скарына, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч і інш.), народныя рамёствы (ткацтва, саломапляценне, ганчарства і інш.), народны касцюм, прырода Беларусі.

Заслухоўваецца песня «Слуцкія ткачыхі». Згадваюцца беларускія песні, народныя і аўтарскія.

— Як трэба захоўваць гэтую спадчыну для нашчадкаў, тых, хто будзе жыць пасля нас?

***4. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 33.

— Прачытайце назву верша. Разгледзьце малюнак да яго. Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў вершы? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Прачытайце верш. Ці правільныя вашы меркаванні? Што падказаў вам загаловак тэксту?

— Як разумее хлопчык значэнне слова «Радзіма»? Ці згодны вы з такім тлумачэннем? Чым бы дапоўнілі яго? Як бы вы самі растлумачылі значэнне гэтага слова?

Арганізуецца гутарка аб тым, што ў паняцце «Радзіма» ўваходзіць і тое, што вакол чалавека (сваякі, родны дом, прырода, родны горад ці вёска), і тое, што не акінеш вокам (родная краіна: яе народ, культура народа, прырода).

— Спішыце верш. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

Навучэнцы запісваюць тэкст у сшыткі. Адзін з вучняў каменціруе правапіс слоў падчас запісу.

Практыкаванне 34.

— Прачытайце. Што апісвае аўтар у вершы? Якое пачуццё да роднай Беларусі перадае ў ім? Гэты верш пакладзены на музыку. Зараз мы з вамі паслухаем песню «Люблю цябе, Белая Русь». На вашу думку, якая мелодыя будзе ў гэтай песні? (Вучні выказваюць свае меркаванні, потым слухаюць першы куплет песні.)

— А зараз паспрабуйце адказаць на наступныя пытанні: якая асноўная думка тэксту? На што ўказвае яго загаловак? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

— Давайце звернемся да рубрыкі «Завяжы вузялок!», дзе змешчана важная інфармацыя, якую трэба памятаць, і праверым, ці правільна мы адказалі на пытанні.

Спачатку настаўнік, а потым вучні чытаюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы.

**III. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 35.

— Прачытайце сказы. Ці ўтвараюць яны тэкст? Што трэба зрабіць са сказамі, каб атрымаўся тэкст? Пастаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці. (Навучэнцы зачытваюць тэкст, які атрымаўся.) Пра што гэты тэкст? Які загаловак найбольш падыходзіць да яго? Ці ўказвае загаловак на тэму тэксту?

***2. Развіццё маўлення.***

— А зараз я задам пытанне для знаўцаў нашай краіны: якую цікавую інфармацыю вы можаце паведаміць пра Белавежскую пушчу?

Вучні расказваюць пра тое, дзе знаходзіцца Белавежская пушча, каго і што там можна ўбачыць, як яна звязана з Дзедам Марозам. Настаўнік вывешвае фотаздымкі пушчы, жывёл, якія там жывуць і занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза.

— Вы бачыце, што без падрыхтоўкі цяжка даць поўны адказ на гэтае пытанне. Таму да наступнага ўрока тыя вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі сваёй краіны, могуць выканаць заданне для эрудытаў на с. 21. Вам неабходна будзе падрыхтаваць невялікае паведамленне (3–4 сказы) пра тое, чым адметная Белавежская пушча. Знайсці патрэбныя звесткі вы зможаце ў Энцыклапедыі прыроды Беларусі або ў інтэрнэце.

Практыкаванне 36.

— Прачытайце назву тэксту. Разгледзьце фотаздымак. На вашу думку, пра што пойдзе размова ў тэксце? Прачытайце тэкст. (Чытанне тэксту вучнямі.) На тэму ці асноўную думку ўказвае яго загаловак? Чым цікавы і ўнікальны Нясвіжскі замак?

— Прачытайце сказы, пры дапамозе якіх можна выказаць асноўную думку тэксту. (Вучні зачытваюць першы і другі сказы тэксту.) Выпішыце іх. Падкрэсліце ў сказах словы, правапіс якіх трэба правяраць. (Пасля самастойнага запісу сказаў адзін з вучняў зачытвае словы, напісанне якіх трэба правяраць, і вусна падбірае да іх праверачныя словы: *беларускі — беларусы, Нясвіжскі — у Нясвіжы, наш — нашы.*)

***3. Развіццё маўлення.***

— Хто з вас ужо быў на экскурсіі ў Нясвіжскім замку? Што вас там асабліва ўразіла, што запомнілася? (Вучні, якія былі ў замку, дзеляцца сваімі ўражаннямі. Настаўнік у гэты час можа паказаць прэзентацыю, прысвечаную Нясвіжскаму замку.)

— А зараз уявіце сабе, што да вас прыехалі сваякі або добрыя знаёмыя з іншай краіны. Якія славутасці нашай мясцовасці можна паказаць гасцям? (Настаўнік і дзеці прыгадваюць, чым славіцца іх мясцовасць. Па магчымасці, настаўнік паказвае фотаздымкі памятных мясцін, славутых землякоў.) Што можна расказаць пра іх?

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 37.

**V. Вынік урока.**

— Чым аб'яднаны сказы ў тэксце? На што можа ўказваць загаловак тэксту?

## Урок 7. Прыметы тэксту

***Мэты:*** замацоўваць веды вучняў пра тэкст як цэласнае выказванне на пэўную тэму, пра загаловак як сродак прэзентацыі тэксту, па якім можна прагназаваць тэму або асноўную думку тэксту; адпрацоўваць уменні вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, суадносіць загаловак з тэмай і асноўнай думкай тэксту, вызначаць спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце; узбагачаць слоўнікавы запас вучняў прыказкамі, развіваць

мысленне, звязнае вуснае маўленне; выхоўваць любоў да працы, жаданне працаваць на карысць іншых.

***Абсталяванне:*** малюнкі будкі, шпакоўні, сінічніка, свінарніка, кароўніка, буслянкі, канюшні, вулея.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш, які вы запісалі. Пра што гэты верш? На што ўказвае яго загаловак? Як адносіны да беларускай мовы перадае аўтар у вершы? Прачытайце тыя словы з верша, у якіх ўстаўлялі літары, і растлумачце іх правапіс.

— Якія цікавыя звесткі пра Белавежскую пушчу вы падрыхтавалі да ўрока?

Заслухоўваюцца выказванні падрыхтаваных вучняў.

**II. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 38.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць верш.) Чаму гарохавая градка самая любімая ў Паўлінкі? (Заслухоўваюцца адказы вучняў.) Знайдзіце ў тэксце сказ, які дае адказ на гэта пытанне. Выпішыце яго. На тэму ці асноўную думку ўказвае загаловак тэксту?

— Выпішыце з тэксту ў алфавітным парадку назвы гародніны. (Вучні выконваюць заданне самастойна. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага. Настаўнік прад'яўляе на дошцы правільны варыянт запісу.)

***2. Развіццё маўлення.***

— Раскажыце, якія карысныя справы робіце вы для сваіх сваякоў. (Заслухоўваюцца выказванні ўсіх вучняў, якія пажадаюць расказаць пра сваю працу на карысць іншых.)

***3. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 41.

— Прачытайце прыказкі і запомніце іх. Чаму так гавораць? Назавіце прыказку, якая падыходзіць да тэксту з практыкавання 38 і дапамагае выказаць яго асноўную думку. Запішыце гэтую прыказку па памяці. (Пасля выканання задання праводзіцца самаправерка напісанага.)

Практыкаванне 39.

— Прачытайце назву верша. На вашу думку, пра што пойдзе ў ім размова? Пазнаёмцеся са значэннем слоў *у гуморы, знарок* у слоўніку да практыкавання. Прачытайце верш. (Вучні чытаюць верш.) Ці змаглі мы прадугадаць змест верша? Тэму ці асноўную думку верша падказвае яго загаловак? Назавіце сказ, у якім выказваецца асноўная думка верша. Выпішыце яго. (Пасля запісу сказа праводзіцца самаправерка напісанага.)

Назавіце ў вершы словы, правапіс якіх трэба правяраць. (Вучні па чарзе называюць словы з верша з парнымі звонкімі–глухімі зычнымі на канцы і ў сярэдзіне слоў, вусна падбіраюць да іх праверачныя.)

Практыкаванне 40.

— Прачытайце верш. Што майструе гаспадар для Бобіка? Як называецца домік для сабакі?

— Якія зычныя гукі часцей паўтараюцца ў вершы? Навучыцеся выразна і правільна чытаць яго. (Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка верша.)

— На тэму ці асноўную думку ўказвае загаловак верша? Якая асноўная думка верша?

— Спішыце верш, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс выдзеленых слоў у ім. (У час запісу верша адзін з вучняў каменціруе напісанне выдзеленых слоў.)

***4. Развіццё маўлення.***

— Якім яшчэ жывёлам людзі майструюць або дапамагаюць будаваць жыллё? (Вучні называюць жывёл, успамінаюць назвы іх жылля, настаўнік вывешвае адпаведныя малюнкі на дошку (рыс. 2).)

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 42.

**IV. Вынік урока.**

— Чым аб'яднаны сказы ў тэксце? Як можа выказвацца асноўная думка ў тэксце?

## Урок 8. Прыметы тэксту

***Мэты:*** замацоўваць веды вучняў пра тэкст як цэласнае выказванне на пэўную тэму, пра загаловак як сродак прэзентацыі тэксту, па якім можна прагназаваць тэму або асноўную думку тэксту; адпрацоўваць уменні вызначаць тэму і асноўную думку тэксту; пазнаёміць з тым, што адна і тая ж тэма можа быць па-рознаму раскрыта ў розных тэкстах; развіваць мысленне, фантазію, звязнае вуснае і пісьмовае маўленне вучняў; выхоўваць любоў да прыроды, эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карціна беларускага мастака (напрыклад, Валерыя Рыбакова) і фотаздымак, на якіх адлюстраваны лістапад; малюнкі вырабаў з асенняга лісця.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш. На тэму ці асноўную думку ўказвае яго загаловак? Прачытайце радок, у якім перадаецца асноўная думка верша. З кім




*Рыс. 2*



Рыс. 3



Рыс. 4

вы любіце хадзіць у лес? Што вы там звычайна робіце?

— Назавіце ў вершы словы, якія адрозніваюцца адным гукам (*густы — кусты*). Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

**II. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 43.

— Прачытайце тэксты. Якой тэмай яны аб'яднаны? Які з тэкстаў апісвае лістапад больш дакладна, а які — больш вобразна?

На дошцы прымацаваны рэпрадукцыя карціны Валерыя Рыбакова (рыс. 3) і фотаздымак (рыс. 4):

— Разгледзьце рэпрадукцыю карціны беларускага мастака Валерыя Рыбакова і фотаздымак. Да якога з тэкстаў у якасці ілюстрацыі лепш падабраць рэпрадукцыю карціны, а да якога — фотаздымак? Які з тэкстаў можна сустрэць у мастацкай кнізе, а які — у энцыклапедыі?

Практыкаванне 44.

— Прачытайце і адгадайце загадку. Назавіце ў ёй словы, якія падказалі адгадку. Запішыце загадку разам з адгадкай.

***2. Развіццё маўлення.***

— Раскажыце, што можна зрабіць з асенняга лісця. (Вучні называюць вырабы з лісця, настаўнік вывешвае адпаведныя малюнкі (рыс. 5). Можа праводзіцца адваротная праца: па малюнках называюцца вырабы з асенняга лісця.)

***3. Праца са слоўнікавым словам*** *восенькскі.*

— Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *восенькскі*. Вымавіце гэтае слова. Назавіце па парадку гукі ў ім. Колькі гукаў і колькі літар у гэтым слове? Чаму літар у ім больш, чым гукаў? Запішыце слова, арфаграфічна правільна прагаворваючы яго.

На дошцы запісаны сказ:

*Цёплым* ***асеннім*** *днём дзеці прыйшлі ў парк.*

— Прачытайце сказ, запісаны на дошцы. Замяніце выдзеленае слова блізкім па значэнні слоўнікавым словам. Запішыце сказ, які ў вас атрымаўся.

***4. Развіццё маўлення.***

Практыкаванне 45.

— Прачытайце назву і пачатак апавядання. (Вучні зачытваюць.) Як вы думаеце, што магло здарыцца з лістком клёна восенню? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Разгледзьце малюнкі. Якому з іх адпавядае пачатак апавядання? Прыдумайце працяг апавядання з апорай на малюнкі. (Навучэнцы калектыўна прыдумваюць працяг апавядання па серыі малюнкаў.) Давайце запішам тэкст, які ў нас атрымаўся. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі.)



Рыс. 5

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 46. (У якасці творчага варыянта дамашняга задання можна прапанаваць вучням, якія любяць пафантазіраваць, прыдумаць свой працяг апавядання пра восенькскія прыгоды кляновага лістка і падрыхтавацца расказаць яго ў класе.)

**IV. Вынік урока.**

— Чым аб'яднаны сказы ў тэксце? Ці аднолькавымі атрымліваюцца творы на адну і тую ж тэму ў розных аўтараў? Чаму? Чым адрозніваюцца тэксты на адну і тую ж тэму ў мастацкіх кнігах і ў энцыклапедыях?

## Урок 9. План тэксту

***Мэты:*** пазнаёміць вучняў з роляй плана тэксту, фарміраваць уменні складаць план тэксту з апавядальных і пытальных сказаў; развіваць мысленне, вуснае звязнае маўленне; выхоўваць міралюбівасць.

***Абсталяванне:*** аўдыёзапіс музыкі да песні «Лясная песня» (сл. А. Русака, муз. Ул. Алоўнікава), музыкі і самой песні «Не пагаснуць зоркі ў небе» (сл. Я. Купалы, муз. М. Янчука).

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст. Які загаловак вы яму далі? На што ўказвае загаловак: на тэму ці на галоўную думку? (Заслухоўваюцца адказы розных вучняў, у кожным асобным выпадку высвятляецца, на што ўказвае падабраны загаловак.) Хто з вас прыдумаў свой працяг апавядання пра восеньскія прыгоды кляновага лістка? Давайце паслухаем апавяданні, якія атрымаліся. (Заслухоўваюцца адказы падрыхтаваных вучняў.)

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 47.

— Прачытайце тэкст. (Тры вучні па чарзе зачытваюць тэкст па частках услых. Астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якую песню іграла дзяўчынка? Чаму ноты з песні падхапілі людзі і птушкі? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці галоўную думку? Паслухайце мелодыі песень і скажыце, якая з іх падыходзіць для песні аб міры, свой адказ абгрунтуйце. (Настаўнік прапануе вучням паслухаць, напрыклад, мелодыю да песень «Лясная песня», «Не пагаснуць зоркі ў небе». Калі вучні выбіраюць патрэбную мелодыю і абгрунтоўваюць свой выбар, настаўнік дае магчымасць вучням праслухаць песню і пацвердзіць свае меркаванні.)

Практыкаванне 48.

— Разгледзьце малюнкі. Давайце з апорай на іх падзелім тэкст з папярэдняга практыкавання на часткі. Знайдзіце і зачытайце частку тэксту, якая адпавядае першаму малюнку. (Вучні зачытваюць першы абзац тэксту.) Якую назву можна даць ёй? *(Дзяўчынка іграла на раялі.)* Знайдзіце і зачытайце частку тэксту, якая адпавядае другому малюнку. (Вучні зачытваюць другі абзац тэксту.) Якую назву можна даць ёй? *(Людзі падхапілі песню аб міры.)* Знайдзіце і зачытайце частку тэксту, якая адпавядае трэцяму малюнку. (Вучні зачытваюць трэці абзац тэксту.) Якую назву можна даць ёй? *(Птушкі ўсюды разнеслі песню аб міры.)* Давайце запішам загалоўкі кожнай часткі і пазначым іх лічбамі. (Адзін з вучняў запісвае план тэксту на дошцы, астатнія робяць гэта ў сшытках.)

***2. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

— Дзеці, мы толькі што запісалі план тэксту. Звярніце ўвагу на рубрыку «Завяжы вузялок!» і запомніце, што план раскрывае змест тэксту, перадае паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы.)

***3. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 49.

— Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку? Якога слова не ведала дзяўчынка? *(Разлузаць, разлушчыць.)* На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў першай частцы? У другой? У трэцяй?

— Пастаўце пытанні да кожнай часткі тэксту. Карыстайцеся падказкамі, прапанаванымі ў практыкаванні. Давайце запішам план тэксту. (Адзін з вучняў запісвае план тэксту на дошцы, астатнія робяць гэта ў сшытках.)

***4. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

— Параўнайце план тэксту «Любімая песня» і план тэксту «Распрані яе». Што іх аб'ядноўвае? *(Раскрываюць змест тэксту і перадаюць паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі.)* Чым яны адрозніваюцца? *(Адзін складзены са сцвярджэнняў, другі — з пытанняў.)*

— Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы, і адкажыце, як можна скласці план тэксту. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы, і даюць адказ на пытанне.)

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 50.

— Дома вам неабходна будзе падзяліць тэкст на часткі, выкарыстаўшы прапанаваны план, і запісаць толькі тую частку, якая адпавядае заданню.

**IV. Вынік урока.**

— Што раскрывае план тэксту?

## Урок 10. План тэксту

***Мэты:*** замацоўваць веды навучэнцаў пра ролю плана тэксту, пра паслядоўнасць дзеянняў пры складанні плана гатовага тэксту, фарміраваць уменні аднаўляць дэфармаваны план тэксту, аднаўляць дэфармаваны тэкст з апорай на план, складаць план гатовага тэксту; развіваць мысленне, вуснае звязнае маўленне; выхоўваць любоў да прыроды, клапатлівыя адносіны да яе.

***Абсталяванне:*** плакат з адлюстраваным на ім алгарытмам пабудовы плана тэксту.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— На колькі частак вы падзялілі тэкст «Клапатлівая гаспадыня»? Прачытайце другую частку тэксту.

**II. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 51.

— Прачытайце тэкст. (Тры вучні па чарзе зачытваюць тэкст па частках услых. Астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Што можна ўбачыць на лясным возеры? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку? (Заслухоўваюцца

меркаванні вучняў.) На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў першай частцы? Другой? Трэцяй?

— Прачытайце план тэксту, прапанаваны ў практыкаванні. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць? Запішыце выпраўлены план.

— Разгледзьце малюнак на с. 33. Якой частцы тэксту ён адпавядае? Спішыце другую частку тэксту, растлумачце правапіс літар ***е, ё – я*** ў словах. (Навучэнцы запісваюць частку тэксту ў сшытку, па чарзе каменціруюць правапіс літар ***е, ё – я*** ў словах кожнага сказа.)

Практыкаванне 52.

— Прачытайце дэфармаваны тэкст. (Чатыры вучні па чарзе зачытваюць тэкст па частках услых. Астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Што парушана ў тэксце? Аднавіце паслядоўнасць частак тэксту з апорай на прапанаваны план.

— На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці асноўную думку? (Заслухоўваюцца меркаванні вучняў.) Знайдзіце і зачытайце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту. Спішыце гэты сказ. (Пасля запісу сказа вучнямі арганізоўваецца самаправерка напісанага.)

***3. Складанне алгарытму пабудовы плана тэксту.***

Практыкаванне 53.

— Давайце ўсе разам вызначым паслядоўнасць дзеянняў пры працы над планам і складзём алгарытм пабудовы плана тэксту. Будзем карыстацца падказкамі з практыкавання.

— Прачытайце ўслых тэкст «Удод» і назавіце першы крок у пабудове плана тэксту. (Адзін з вучняў услых чытае тэкст. Пасля праслухоўвання апавядання навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 1 патрэбнымі словамі: *чытаем* ***тэкст****, дзелім яго на сэнсавыя* ***часткі****.*)

— Перачытайце тэкст пад пунктам 2 самі сабе і назавіце другі крок у пабудове плана тэксту. (Пасля перачытвання тэксту з выдзеленымі апорнымі словамі і спалучэннямі навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 2 патрэбнымі словамі: *вылучаем галоўнае ў* ***кожнай частцы****.*)

— Дапоўніце план пад пунктам 3 патрэбнымі ловамі. (Пасля называння пунктаў плана навучэны дапаўняюць сказ з пункта 3 патрэбнымі словамі: іем *назву* ***кожнай частцы****.*)

— Пералічыце яшчэ раз паслядоўнасць дзеянняў ы складанні плана гатовага тэксту. (Адзін з няў узнаўляе алгарытм пабудовы плана тэксту. таўнік вывешвае на дошку адпаведны плакат.)

**ІІ. Дамашняе заданне.**

рактыкаванне 54.

- Дома вам неабходна будзе запісаць план тэк-Удод» з практыкавання 53.

**Вынік урока.**

Што перадае план тэксту? Якую паслядоўдзеянняў трэба захоўваць пры складанні

**Урок 11. Навучальны падрабязны**

***Мэты:*** фарміраваць уменне складаць чыць падрабязна пераказваць тэкст па ка складзеным плане, развіваць звязнае м навучэнцаў, іх творчыя здольнасці, вь клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** падручнік, плакат з адлк ным на ім алгарытмам пабудовы плана тэкс

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце план тэксту, які ў вас маўся.

— Паглядзіце на плакат (на дошцы вісіць кат, на якім адлюстраваны алгарытм пабу плана тэксту, пры гэтым апісанне другога к алгарытму закрыта палоскай паперы). Адна паслядоўнасць дзеянняў пры складанні плана сту. (Дзеці называюць паслядоўнасць дзеяні настаўнік адкрывае апісанне другога кроку ал рытму.)

**ІІ. Праца па развіцці маўлення.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэт ўрока.***

— Сёння мы з вамі будзем рабіць падрабязн. пераказ тэксту «Адказны за прыроду». Якога ча лавека называюць адказным? На вашу думку, пра што пойдзе размова ў тэксце, мяркуючы па назве? (Выслухоўваюцца розныя меркаванні вучняў.)

***2. Чытанне тэксту.***

Практыкаванне 55.

— Прачытайце тэкст. (Чатыры вучні па чарзе зачытваюць тэкст па частках услых.)

***3. Гутарка па змесце тэксту.***

— Чаму Алёшу можна назваць адказным чалавекам? Якую добрую справу ён сам вырашыў зрабіць? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці асноўную думку?

— Прачытайце прыказкі з практыкавання 56. Чаму так гавораць? Якія з прыказак падыходзяць для характарыстыкі Алёшкі? (Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.)

— Разбяром апавяданне па парадку. Пра што гаворыцца ў пачатку тэксту? *(Пра даручэнне, якое далі Алёшку ў класе.)* Пра што расказваецца далей? *(Пра тое, што хлопчык вырашыў дапамагаць птушкам.)* Як выглядала сталоўка для птушак? *(Дошчачкі на шнурках, якія віселі на сасне і бярозе; на іх насыпаныя хлебныя крошкі і крупы.)* Якія сказы тэксту падказалі вам, што сталоўка спадабалася птушкам? (Вучні зачытваюць апошні абзац тэксту.) Што значыць выраз ***прыпісаліся да сталоўкі***? Якім выразам яго можна замяніць пры пераказе? *(Пастаянна наведваюць сталоўку.)*

***4. Калектыўнае складанне плана.***

— Звярніцеся да рубрыкі «Завяжы вузялок!» (с. 36) і адкажыце, што трэба зрабіць перад тым, як пісаць пераказ тэксту. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную дають адказ на пытанне

— На колькі частак можна падзяліць тэкст? Прачытайце першую частку тэксту. Якую назву ёй можна даць? (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі часткамі.)

План запісваецца на дошцы. Ён можа мець наступны выгляд:

План.

1) Адказнае даручэнне.
2) Знайшоў работу.
3) Сталоўка для птушак.
4) Пастаянныя наведвальнікі.

***5. Вусны пераказ тэксту паводле плана і па апорных словах.***

— Вусна перакажыце тэкст, выкарыстоўваючы спалучэнні слоў, запісаныя на дошцы.

(Апорныя словы і спалучэнні з практыкавання можна запісаць на дошцы.)

Заслухоўваюцца пераказы 1–2 вучняў.

***6. Арфаграфічная і пунктуацыйная падрыхтоўка.***

— Яшчэ раз звярніце ўвагу на словы, запісаныя на дошцы. Растлумачце правапіс выдзеленых літар (тлумачыцца правапіс літары ***ў,*** літар ***е, ё – я, д – дз, т – ц,*** зацвярдзелых зычных у словах).

Звяртаецца ўвага на пунктуацыйнае афармленне сказаў: *Вераб'і, сініцы, снегіры застаюцца зімаваць. На дошчачкі хлопчык сыпаў хлебныя крошкі, крупы.*

***7. Напісанне пераказу вучнямі.***

***8. Самаправерка напісанага.***

Настаўнік фіксуе ўвагу вучняў на тым, што неабходна перачытаць напісаны пераказ двойчы.

Пры першасным чытанні трэба прасачыць правільнасць выкладу зместу.

Пры другасным чытанні неабходна прааналізаваць правільнасць напісання слоў і пастаноўкі знакаў прыпынку.

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 59. (У якасці творчага варыянта дамашняга задання можна прапанаваць практыкаванне 57.)

**IV. Вынік урока.**

— Якія цяжкасці ўзніклі ў вас пры пераказе тэксту?

— Што трэба скласці перад тым, як пісаць пераказ, сачыненне, рабіць вуснае паведамленне?

**Крыніцы ілюстрацый**

http://content.nlb.by/content/dav/nlb/portal/content//File/Portal/Novostl/2012/October/2012.10.05/Skorina_portal/1.jpg
http://blog.childlib.by/wp-content/uploads/2016/07/.jpg
https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcTQUfulmefqCFxzqaKQkOswgC2VJhPsd6DK1rH9CicBBOyIYDeX
http://media.vremyan.ru/images/640_480/images_158750.jpg
http://beiarusgid.by/wp-content/uploads/2015/05/iMG_0845.jpg
http://www.artmuseum.by/assets/images/News/2012_Fabruary/Pasy/2_pasy_Small.jpg
http://1.bp.blogspot.com/-iu4-UTYUsYM/T31cPzWBS9I/AAAAAAAAKj0/5a2K4tmQiIM/s1600/ +western+palesse2.jpg
http://skarbnica.by/wp-content/gallery/folk-cloth/thumbs/thumbs_kalinkovichi_6-48-12.jpg
http://triphints.ru/media/uploads/articles/d2c41f919dc0045b99e1a67a4241c98e/article_541bf05b647c28.67287296.jpeg
https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcQAJrJ_b_1mLdZ2y-YHRtaTnrMY6xr6eq-PhOI-KNLSmt8iLZUx8QrWfFw
http://media.Istockphoto.com/illustrations/starling-wlth-nesting-box-and-sparrow-on-white-background-Illustration-Id534320320
http://domikru.net/wp-content/uploads/2015/03.jpg
http://gid-str.ru/images/gidstr/2014/03.jpg
http://www.agro-ferma.ru/upload/mediallbrary/a1b/a1ba38cb942b0fd564b6d11d09523a14.jpg
http://imgtube.ru/images/stories/2013/02/920-aisty/1.jpg
http://miragro.com/sites/default/files/jivotnovodstvo/loshadi/konyushnya.jpg
http://doferm.ru/wp-content/uploads/2014/06/paseka.jpg
http://art.rybakow.com/images/painting_golden_autumn_waltz_267.jpg?crc=3891415296
https://i.ytimg.com/vi/Usdd7JtNL0E/maxresdefault.jpg
https://4.404content.com/1/FF/2F/1009941215632426279/fullsize.jpg
http://adalin.mospsy.ru/img6/leaf25.jpg
http://be-happywoman.ru/wp-content/uploads/2015/09/osenniy-venok.jpg
http://www.domechti.ru/wp-content/uploads/2013/11/osennij-dekor-iz-sukhikh-listev-12.jpg
http://karaponder.ru/wp-content/upioads/2014/09/osennie-detskie-podelki_031.jpg
https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcR1g6cQjL5ba7Eh3vnbFWaAbNYdifS19IqC_nYDHpcruir1WLHVjQ

***В. І. Свірыдзенка****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*